***Метад мастацкай рэканструкцыі абраду*** і яго этнафоніі як гукаідэалу, «голасу вёскі», даў магчымасць студэнтам-дыпломнікам самастойна наладзіць свята ў новых тэрытарыяльных і сэнсавых умовах. Галоўнай мэтай было як мага бліжэй да арыгіналу прэзентаваць вялікаборскі абрад мінскай публіцы, адаптуючы яго да музея-скансэна.

Вынікі выкарыстання метадалогіі, якая будуецца на пералічаных вышэй метадах, былі ацэнены падчас рэалізацыі дыпломнага праекта – рэвіталізацыі абраду Провады русалкі з яго носьбітамі (чэрвень 2014 года, вёска Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці) і ў ходзе мастацкай рэканструкцыі абраду (май 2015 года, Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, вёска Азярцо Мінскага раёна). Па водгуках сведкаў і ўдзельнікаў, вынікі рэалізацыі будуць відавочна спрыяць паступоваму руху да аховы і пераемнасці русальнай традыцыі як часткі «вуснай і няўлоўнай спадчыны» Беларусі.

**Спіс літаратуры:**


1. Беларускі фальклор: энцыклапедыя : у 2 т. Т.2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – Яшчур / рэдкал. : Пашкоў, Г.П. [і інш.] – Мінск : БелЭн. – 2006. – 832 с. : іл.
2. Гульні, забавы, ігрышчы / рэдкал. : А.С. Фядосік. – Мінск : Бел. Навука, 1996. – 534 с.
3. Добровольский, В.Н. Нечистая сила в народных верованиях / В. Н. Добровольский. – М. :Живая страница. – 1908, вып.3.
4. Жуланова, Н.И. Молодежное фольклорное движение / Н.И. Жуланова // Фольклор и молодёжь. От истоков современности. – М. : Наука, 2000. – С. 53-55.



***Тацяна Мармыш***


## ЭТЫЧНАЯ ПАРАДЫГМА ЗАХАВАННЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ


*Артыкул прысвечаны канцэптуалізацыі фарміравання этычнай падыгмы ў кантэксце захавання нематэрыяльнай спадчыны, рэпрэзентаванай, у тым ліку, праз 12 адпаведных этычных прынцыпы ЮНЕСКА.*



***Tatstsyana Marmysh***


## ETHICAL PARADIGM OF INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE SAVING


*The paper is dedicated to the conceptualization of the formation of an ethical paradigm to the safeguarding of intangible heritage. The paradigm is represented, in particular, via 12 relevant ethical principles of UNESCO.*


Этыка як катэгорыя гуманітарыстыкі сэнсава закранае агульначалавечую мараль, што, находзячыся на пазіцыях паміж крытыкай з боку культурнага рэлятывізму і выклікамі суб’ектывізму, аб’ядноўвае на глебе духоўна-гуманістычнай скіраванасці. Увасобленая ў прынцыпах, нормах, дамінантах, якія садзейнічаюць прыняццю рашэнняў і выбару, этыка знаходзіць выражэнне ў розных сферах жыцця сучаснага грамадства.

Этычныя прынцыпы ў сферы захвання нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС) былі прапанаваны падчас дзясятай сесіі Міжурадавага камітэта ЮНЕСКА па захаванні НКС (2015) і маюць прыкладны характар. Асновай для іх фармулявання стала ўсведамленне пагрозаў, звязаных, перадусім, з трансфармацыяй умоў жыццядзейнасці НКС пад уплывам наступстваў галабальнай эканамічнай прасторы. Такі кантэкст абумоўлівае разгляд нематэрыяльнай спадчыны сярод катэгорый «справядлівы гандль», «этычнае спажыванне», «этычны тавар» і зводзіць яе інтэрпрэтацыю выключна да «культурнага прадукту», тым не менш, падкрэслівае рэальныя небяспекі ў аспекце манетызацыі спадчыны.

Рэфлексіі на тэму этыкі і НКС выяўляюцца ад моманту стварэння Канвенцыі ЮНЕСКА аб захаванні НКС, затым – аператыўнага кіраўніцтва Канвенцыі (2008, рэдакцыі 2010, 2012, 2014 гг.): «Дзяржавы-ўдзельніцы заахвочваюцца да распрацоўкі і прыняцця кодэксаў этыкі... з тым, каб забяспечыць належныя шляхі павышэння дасведчанасці аб нематэрыяльнай культурнай спадчыне на адпаведных тэрыторыях» [4]. Інтэнцыя да этызацыі сферы захавання НКС прысутнічае ў прапанове праекта дадатковага раздзелу аператыўнага кіраўніцтва, на падставе чаго можна меркаваць аб паступовым развіцці зместу Канвенцыі. Раздзел будзе закранаць пытанне сувязі НКС і ўстойлівага развіцця, у прыватнасці, праз прынятце кодэксаў этыкі для рэгулявання доступу да традыцыйных здабыўных промыслаў у межах харчовай бяспекі, падтрымкі выбару носьбітаў у спосабах кіравання іх спадчынай, садзеянне развіццю этычных эканамічных адносінаў для ўмацавання мясцовай эканомікі [3].

Паводле экспертнай супольнасці ЮНЕСКА ў якасці этычных прынцыпаў па захаванні НКС дэкларуецца:

1) вызначэнне першаснай ролі носьбітаў у захаванні НКС;

2) прызнанне і павага правоў супольнасцей, груп і індывідуумаў у працягванні рэпрэзентацыі і ўвасабленні НКС, атрымання ведаў і навыкаў, неабходных для яе жыццяздольнасці;

3) прыярытэт узаемапавагі, павагі да НКС і ўзаемнага прызнання НКС ва ўзаемаадносінах дзяржаў, супольнасцяў, груп і індывідуумаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) празрыстая супраца, дыялагічнасць, перамовы і кансультацыі і залежнаць ад згоды носьбітаў падчас любых стасункаў з імі;

5) забеспячэнне доступу носьбітаў спадчыны да інструментаў, прадметаў, артэфактаў, культурных і прыродных прастораў, месцаў памяці, існаванне якіх неабходна для НКС. Традыцыйныя практыкі рэгулявання доступу павінны цалкам спраўджвацца, нават там, дзе яны абмяжоўваюць шырокі доступ;

6) доступ да ўласнай НКС, якая не мусіць падвяргацца знешняму ацэньванню як з пункту гледжання аксіялогіі, так і коштаў, для кожнай супольнасці;

7) атрыманне выгоды ад выкарыстання, даследавання, дакументавання, прамоцыі і адаптацыі спадчыны членамі супольнасцяў-носьбітаў;

8) пастаянная павага да дынамічнай і жывой прыроды НКС, пры гэтым аўтэнтычнасць і эксклюзіўнасць не могуць уяўляць праблемы ў яе захаванні;

9) дакладнае вызначэнне супольнасцямі, лакальнымі, нацыянальнымі і транснацыянальнымі арганізацыямі і асобнымі людзьмі ўплыву любых уздзеянняў на жыццяздольнасць НКС або супольнасцей-носьбітаў;

10) вырашальная роля носьбітаў НКС у вызначэнні пагроз іх спадчыне, уключаючы дэкантэкстуалізацыю, камерцыялізацыю, таварызацыю, увядзенне ў зман і музеефікацыю, а таксама ў вызначэнні шляхоў прадухілення і змякчэння пагрозаў;

11) павага да культурнай разнастайнасці і ідэнтычнасці супольнасцей, груп і індывідуумаў. Увага да гендарнай роўнасці, далучэнне моладзі і этнічная роўнасць павінны быць улічаны ў распрацоўку і рэалізацыю мер па ахове;

12) пабудова супрацоўніцтва міжрэгіянальных, рэгіянальных і міжнародных бакоў ў рамках аховы НКС. Носьбіты НКС не павінны быць адчужаныя ад іх спадчыны [2][11].

У перспектыве этычныя прынцыпы лягуць у аснову рэкамендацыйнага ўніфікаванага дакумента – мадэльнага кодэксу этыкі. Варта адначыць, падобныя кодэксы маюць некаторыя прафесійныя супольнасці, датычныя феномена спадчыны (Кодэкс этыкі амерыканскай асацыяцыі антраполагаў, 1998; Кодэкс музейнай этыкі ICOM, 1986), аб’яднаныя агульнымі зацікаўленасцямі (Хартыя турызма і Кодэкс турыста,1985) і інш.

Як каштоўнаснае ядро будучага мадэльнага кодэксу, этычныя прынцыпы разглядаюцца ЮНЕСКА з пазіцый антрапалогіі, камунікацыі, медый, музеялогіі, інтэлектуальнай уласнасці і права, турыстыкі [3]. Падкрэсленая міждысцыплінарнасць рэпрэзентуе сукупнасць новых задач у разрэзе *этаса* нематэрыяльнай спадчыны як часткі сучаснай культуры, спрыяе пашырэнню яе рамак праз максімальны дыяпазон іх праекцыі – ад лакальнага значэння рэгулятара і транслятара сацыяльнага досведу, сістэмы каштоўнасцей, норм і правілаў, прадпісанняў і рэгламентацый да інтэграцыйнай ролі ў міжкультурным дыялогу і культурнай разнастайнасці.

Рэсурс міждысцыплінарнасці, прыцягненне ўсіх магчымых зацікаўленых бакоў, прадугледжвае актывізацыю *інклюзіўнагападыходу*, які забяспечвае варыянтнасць у інтэрпрэтацыі ідэі этыкі ў захаванні нематэрыяльнай культуры і выяўленне залежнасцяў паміж сферамі прымянення этычных прынцыпаў. Інклюзія задае ўніверсальны характар прынцыпаў і аптымізуе камунікатыўны патэнцыял спадчыны.

Краевугольным камянём этычных прынцыпаў сталі вядучая роля і воля носьбітаў (асоб ці лакальнай супольнасці агулам) у пошуку адказа на запыт «што рабіць са спадчынай?»; павага да правоў чалавека, супольнасцей і іх спадчыны; супраца і дыялог – па-сутнасці, універсальныя каштоўнасныя праграмы, у цэнтры якіх змешчаны чалавек як пратагораўская «мера ўсіх рэчаў». Арыентацыя на вынікаючыя адсюль прадметныя вобласці: міжкультурнае ўзаемадзеянне, узаемадзеянне асобы (носьбіта) і культуры (грамадства), датычнасці грамадства і культуры, культуры і прыроды (культурны ландшафт) з тэарэтычнага боку сведчыць аб апоры на *антропацэнтрычны і культурантрапалагічны* падставовыя падыходы ў выпрацоўцы этычных прынцыпаў.

На першы погляд названыя прынцыпы даволі абстрактныя. У такім разе патрабуе ўдакладнення фокус іх адаптацыі да канкрэтных абставінаў. Спецыфіка асаблівасцяў прыватнай сітуацыі ўзнікае на скрыжаванні лакальнага / рэгіянальнага і агульнадзяржаўнага праз ўзаемадзеянне носьбітаў, мясцовых супольнасцяў з дзяржаўнымі і мясцовымі органамі кіравання сферамі культуры, адукацыі, СМІ, установамі сферы культуры. Таму, практычнае абарачэнне этычных прынцыпаў дапаможа нівеліраваць комплекс цяжкасцей ў полі дзеяння гэтых суб’ектаў культуратворчасці. Відавочна неабходнасць высвятлення прававаой прыналежнасці НКС – і, адпаведна, права яе выкарыстання, што асабліва важна ў выпадках, калі адміністрацыйны апарат лакалізуе НКС у прасторы і часе па ўласнай патрэбе (напр., камерцыйнай), а работнікі сферы культуры падмяняюць паняткі «жывая спадчына» і «культурна-дасугавыя праграмы» (гл. раздзел «Ахова і папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі» Рэспубліканскага плана мерапрыемстваў па правядзенні ў 2016 годзе Года культуры [1]), што не адпавядае анталагічнай мадальнасці НКС і не ўхваляецца носьбітамі традыцый. Апрача таго, у айчынным заканадаўстве дакладна не распрацаваны, у адрозненні ад матэрыяльнай культуры, аспект узнікнення і рэалізацыі права ўласнасці (чытай – адказнасці) на НКС, прысутнічае апеляцыя да катэгорый «носьбіт» і «суб'ект права ўласнасці» як да сэнсава ідэнтычных, аднак, іх карэляцыя не зафіксавана.

Прынцыпы этыкі дапамогуць акрэсліць магчымыя межы ўключэння НКС у эканамічную дзейнасць, рэгламентаваць паводзіны знешніх назіральнікаў ці ўдзельнікаў нематэрыяльных практык, што, у большай ступені, тычыцца прадстаўнікоў СМІ, этнатурыстыкі, рост якой назіраецца апошнім часам, і, нарэшце,

[11] Падаюцца ў скарочаным перакладзе.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

замацаваць статус носьбіта як ключавой фігуры, тым самым стаць базай фарміравання *этычнай парадыгмы* захавання НКС. На практыцы гэта мусіць быць выражана ў стварэнні ўмоў для развіцця нематэрыяльнай культуры праз падтрымку носьбітаў, пазбягання фармалізацыі і пераўтварэнняў інструментаў аховы ў самамэты.

**Спіс літаратуры:**


1. Рэспубліканскі план мерапрыемстваў па правядзенні ў 2016 годзе. Года культуры / Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http: //www.kultura.by/page/respubl-kansk-plan-merapryemstva-pa-pravyadzenn-2016-godze-goda-kultury. – Дата доступу : 04.04.2016.
2. Materials on the Expert Meeting on a Model Code of Ethics : ITH/15/10.COM/15.a // UNESCO. Intangible Cultural Heritage [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.unesco.org/culture/ich/en/10com. – Date of access : 07.04.2016.
3. Materialsonthe Expert Meeting on Safeguarding Intangible Cultural Heritage and Sustainable Development // UNESCO. Intangible Cultural Heritage [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.unesco.org/culture/ich/en/9com-november-2014-00574. – Date of access : 09.04.2016.
4. Operational Directives for the Implementation of the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage // UNESCO. Intangible Cultural Heritage [Electronic resource]. – Mode of access : http://www.unesco.org/culture/ich/en/directives. – Date of access : 07.04.2016.



***Вэнь Жань***


## ИСКУССТВО «ЛЮ-БАЙ» В НАЦИОНАЛЬНЫХ ИСТОРИЧЕСКИХ ПАРКАХ КИТАЯ


*В статье рассматриваются особенности садово-паркового искусства Китая, архитектурные объекты, именуемые национальными историческими парками. Художественный прием «лю-бай», широко применяемый в китайской живописи, получил воплощение и в исторических парках. Автор раскрывает функциональный характер «лю-бай», форму его художественного воплощения.*



***Wen Han***


## LIU BAI ART IN NATIONAL HISTORICAL PARKS OF CHINA


*The article discusses the features of landscape art in China, architectural objects which are called national historical parks. Liu-Bai art method, widely used in Chinese painting, was spread and in the art of historical parks. The author reveals functional nature of Liu-Bai as an artistic method in national historical parks in China.*


Китайское садово-парковое искусство представлено в виде семейных парков в районе правобережья реки Янцзы, а также императорских парков Севера. Эти искусно созданные и своеобразные по стилю архитектурные объекты обладают собственной структурой, они самобытны и признаются в мире как важное наследие культуры человека.

В национальной китайской архитектуре жемчужиной района правобережья реки Янцзы являются семейные парковые ансамбли. У китайского народа есть поговорка: «Властвующий картиной – властвует парком, властвующий парком – властвует картиной» [1, с. 210], что указывает на то, что все архитекторы древних парков владели искусством написания картин. Китайские древние парки и пейзажная живопись находятся в родстве и известны как «братские виды искусства». Поэтому художественный прием «лю-бай», получивший применение в исторических парках, испытал прямое влияние идей «лю-бай» китайской живописи. Использование хорошо спроектированных пустот в парках отождествляется с философскими представлениями Лао-цзы о взаимосвязи пустого и полного, что раскрывает внешнюю красоту произведения. Глубокая идея о маленькой земле, вбирающей в себя всю широту макрокосма, предоставила зрителю большие возможности для понимания произведения искусства, позволила выстроить еще более активное и богатое вымышленное пространство. Общие цели китайских древних парков и пейзажной живописи основываются на единстве их идеологий, раскрывающих художественную сущность друг друга.

В китайской исторической садово-парковой архитектуре часто использовался прием «лю-бай». Говорим ли мы о форме, композиции, пространстве, идее парка или о таких деталях, как арочный вход, водоемы, крытые галереи, – во всех элементах отражена красота приема.

Функциональный характер приема «лю-бай» в национальных исторических парках определяется общностью времени и пространства, что стало важной предпосылкой для использования данного приема. Временной фактор был искусно интегрирован в организацию пространства при прогулках людей по паркам,


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ